Ба 52774

УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА

VII
Отд.
31231

# CREDO

МАЛАДНЯК

Ба 52774

УЛАДЗІМЕР ДУБОЎКА

# CREDO

ВЕРШЫ

VII
31231
ОДЕССКАЯ ГОРОДСКАЯ ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА
Бел. аддзел 1994 г.
04209

Выданьне Ц. Б. Маладняка
Менск — 1926

19

1949
ПРОВЕРЕНО

Галоўлітбел № 13409
(У ліку 2000 экз.)
Менск, 2 друкарня БДВ
№ 493.

ОДЕССКАЯ ГОРОДСКАЯ
9-ФЕВ. 1926
ПУБЛИЧНАЯ БИБЛIОТЕКА

042009

# CREDO

# СЬЦЕЖКА

Віешся ты істужкай каляровай,
куды вядзеш—чаму ня ведаць мне?
Сьціскаеш пальцамі лістоў кляновых,
а часам—навальніцай скалатнеш...

Вядзі, няхай... куды жыцьцё ня кініць...
Ня страшна ўсё—няма чаго губляць.
Хоць я пайду і скрозь туманаў сініх,
а пад нагамі будзе ўсё-ж зямля!

Сапраўды—чым мяне ты пераломіш?
бяз хлеба—жыў, і хлеб з крапівы—еў.
А духам быў заўсёды комсамолец
і толькі зірк сьціскаўся і шарэў.

Я не чураўся і патроннай торбы:
кашулю зрэбную, як будзе трэ', парву.
Ужо гарбаты я, а больш жыцьцё ня згорбіць.
Ды што мужыцкую мне зьвяжа галаву?

[library stamp]

Ці я іду па вуліцах маскоўскіх,
ці па шляхох Палескіх я іду,—
нідзе ніколі мне ня будзе коўзка,
бо песьняй праганяю ўсю жуду.

І не прашу я ад жыцьця за многа:
хай Беларусь, мой занядбаны край,
напорным крокам йдзе сваёй дарогай:
на Ўсходзе ясныя агні гарацЬ.

А там—вядзі хоць на зламаньне шыі,
а не—цябе самое павяду.
У песьнях пабудую свой трыкліні
на лозах ніцых кіну сум-жуду.

5/VIII—24

## НІКНЕ ЎСЁ У НЕЙКАЙ ШЭРАЙ МГЛЕ

Нікне ўсё у нейкай шэрай мгле,
маці, маці... родная матуля...
Кажуць мне, што я інтэлігэнт,
бо на мне цяпер—
ня зрэбная кашуля...

Што сказаць ім, хто гавора так?
Можа лепш сказаць... Нічога?
Дзед і бацька быў ратай,
а я сам—пастух,
пастух учора...

І за гонар свой лічу цяпер,
што з асьветай—шлях свой ясна бачу.
Словы, што зьлятаюць ад цябе,
лепш чым воцат
І чым... сын сабачы...

Наша мэта, наша думка вось:
будаваць краіну Працы і Змаганьня
Каб на гонях, занядбаных скрозь,
красавала шчасьце,
красавала вечна Раньне.

Ўсё жыцьцё, і думкі, і душу
на змаганьне за краіны долю
Дык таму спагады не прашу,
што спагады словы—
сэрца коляць.

Сонца косы рве ў тэй шэрай мгле,
маці, маці... любая матуля...
Я, твой сын, цяпер інтэлігэнт
і мяне твае палеткі
ласкава прытуляць?!

5/VI—25

# ЧАСІНА ДЫ З СОКАМ РАБІНЫ

Часіна, ды з сокам рабіны
качаеш мяне ў чорнабыльлі.
На дзіды, на востры шыпшыньнік
ці сэрца, ці дух мой узьбілі.

Калышуцца скаргі і моўкнуць,
разносяцца разам пялёсткі.
Ня хоча Ўладзімер Дубоўка
сьпяваць пад зазубраны лёскат.

Пачаў—хай канчаюць другія,
шляхі—адшукаю сабе я.
Загіну—няхай і загіну,
мне гымнамі будуць завеі.

5/V—25.

# ПАЛЯЖАМ МЫ

Паляжам мы і вецер косьці нашы
паточыць, пылам над лясамі разьнясе.
Ужо сьціскае грудзі цяжкі кашаль
і вусны песень не нясуць красе.

Такі і лёс, такая перагаса:
маркотна мне і рады не дасі.
Задумаешся непакойна часам
і закалоцішся лісьцём асін.

Чаму ня так, як сэрца хоча, просіць:
наадварот і супаратнасьць скрозь.
Пайду у сенажаці ды на росы,
каб супакойна адпачыла скронь.

Іграй, іграй, каханы цымбалісты,
каб дні вясны маёй са струн зьляталі.
Ішлі яны пад вэлюмам імглістым
і гінулі ў жыцьці, як хвалі ў хвалях.

Не шкадаваў, не скардзіўся нікому—
хоць часам дух зьвіваўся ў немы лямант.
І сьвет увесь, нязнаны і знаёмы,
мне выдаваўся нейкай чорнай плямай.

Іграй. іграй, каб струны галасілі
і захліпаліся, як я сягоньня.
Загіну з гукамі ў тумане сінім
а ня схілю ні галаву, ні скроні.

Аддам усё за гукі шчырай песьні,
пакіну гукі ў новым барваваньні.
Ад Віленскіх вазёр да сумнага Палесься
я разьлію душу і згіну у нірване.

Дык грай-жа, грай, каханы цымбалісты,
каб дні вясны маёй са струн зьляталі.
Ішлі яны пад вэлюмам імглістым
і сьцежкаю ішлі... краіна дарагая!..

12/VIII—25

# ВЫ МЭЛЁДЫЙ НЯ СЛУХАЕЦЕ

Вы мэлёдый ня слухаеце,
а я—прыкладаю вуха, да долу:
з Над'язер'я, над лугам
вясна завілася столкамі.

Лясы і бярозы ніцыя
туманамі набраклі вохкімі.
Вецер з лілёвымі сьпіцамі
у гальлі над амшарай вохкае.

Каўнер, адшпіляю шырока,
каб паветра цалавала грудзі.
Нязвычайны, патаемны рокат
сенажаці думак запрудзіў.

Як сказаць, як знайсьці такое
Слова, каб было яно кволае?
Не катуе, але ўсёжткі коліць
і ногі быццам у волаве.

Вочы... Ну зірні дзяўчыне
ў вочы. Глыбіня—як жыцьцё прадоннае.
Нешта ласкоча... Шукай прычыну:
мільгацяць яны віраводныя...

Прабаваў запаліць папяросу,
каб забыцца аб стройным стане.
Тыя цудоўна-русыя косы
завівацца не перасталі.

Так, здаецца, абняў-бы аберуч
і жыцьцё, і лясы, і дзяўчыну.
Вобраз мілы страямі уберацць,
бо у сэрцы нітуецца шчыльна.

30/III—25.

# ВЫЙДУ, ВЫЙДУ, ДЗЕ ГОРАДУ ГРУКАТ

Выйду, выйду, дзе гораду грукат,
дзе афішы на сьценах і тварах.
Не сашчэпяцца вуліцай рукі,
як увосень золкасьцю—травы.

Мільгане зірк у вочы сінія,
каб усьмешкаю вусны торгаць.
Не кажы мне пра ўсякія Сільвы:
не такая мая дарога.

Бо чаруе мяне твая постаць,
поўкажушак, хусьцінка чырвоная.
Галаву трымаеш так проста
і сама сабой задаволена.

Ты раскажаш, пра ўсё раскажаш
і пра тое, што заўтра рана
ня будзеш больш ужо кашляць,
як станеш на высокім кургане.

Засьпяваеш бяз слоў мэлёдыю
і мяне успомніш гукамі.
Сэрца ня будзе пад лёдам,
а вясна не загразьне на бруку.

30/III—25.

## ДЗІВАВАЎСЯ Ї ТАК КАХАЎ

Дзіваваўся і так кахаў,—
наглядзецца ня мог калісьці.
Зубцамі чорных валос—галава
васільком здавалася шалясьцістым...

Час імклівіў кудысьці, грунём,
а і мы ня схілялі калені.
Супакой пагублялі, як восеньню клён,
лісьцё на узьвей вокамгненьняў

Задзівіла, дзяўчынка мая...
Дзе і што? Ці імпэт пахавала?
Сэрца стыне, на вуснах—Ай-я!
А дакоры маўклівыя валам.—

Прысягаліся, або можа так?
Абяцалі узвышша, поплеч?
Што пытаць! Чый пульс не сакатаў?
Што згарае—пакіне попел.

І цяпер вось—усьмешкі няма...
І вочы бліснуць і гаснуць...
І пялёсткі наземіць мак:
бо і ён перажыў сваё шчасьце...

11/II—25.

/53482

Бібліятэка ... імя В. І. Леніна БССР

# Я ШКАДУЮ УСЁЖТКІ СЯБЕ

Я шкадую усёжткі сябе
і мне сорамна сэрца ганіць.
Але-ж праўду кажу цяпер:
я ня верыў, што ёсьць каханьне.

Чуў заўсёды, што гэта жарт,
што і ў попеле золата значна.
А калі запылае ў душы пажар—
трэба песьняй лячыць, ня начы.

І пяяў, калі песьні былі,
як на дзікім камяньні навальніца.
Узрастаў бы чабор ля ральлі
і казалі мне ўсе, што я гіцаль.

Ведаў сам, што сапраўды благі,
што такім і пясок прыгорне.
Не чакаў, што вачэй блакіт
можа быць для мяне прадоньнем.

Не чакаў, што кужэльная каса
абвівае залатым павучыньнем.
А цяперака—што-б ні казаў,
але песьні складаю дзяўчыне.

Бо прыгожай такой як ты—
яшчэ людзі ня ведалі, мусіць.
Бо гадуюць трысьцё балаты—
бязумоўна ў аднэй Беларусі.

Ой, дзяўчына, з блакітам вачэй,
дзе ты возьмеш для душы маёй цуглі?
Будзе лепш, будзе проста лягчэй,
калі будзеш кахаць валацугу.

Я шкадую, шкадую сябе
і мне сорамна сэрца ганіць.
Але-ж праўду кажу цяпер:
я пазнаў, што бывае каханьне...

29. XII—23.

# ВОХКІЯ СЬЦЕЖКІ

Узьвіліся страі высока.
Ну, а далі?—Вохкія сьцежкі.
Налілася каліна сокам.
Ну, а далі?—Сэрца цешыць.

Прыплюснула млява скроні.
Ну, а далі?—Жывём аднойчы.
Прастор туманамі агорне.
Ну, а далі?—Купіны змочыць.

Пашчапаліся вусны ад смагі.
Ну, а далі?—Крыніца плюскочыць.
Пасплятаріся пахі пад пахі.
Ну, а далі?—І вочы на вочы.

Разьлілася зьнямога і слодыч.
Ну, а далі?—Жыцьцё маладое!
Пад нагамі багна і слота,
дык вясна у істоце затое.

Узьвіліся страі высока.
Ну, а далі?—Вохкія сьцежкі.
Налілася каліна сокам.
Ну, а далі?—Сэрца цешыць.

2/IV—25.

## І ГІНУЛІ ЯНЫ

...І гінулі яны за косы Клеопатры,
за вочы тыя, што ня сьняцца нават.
Да ног яе нясьлі,
нясьлі упарта
жыцьцё, свой лёс і славу...

...І гінулі яны у хваляваньні лавы,
якую слаў, радзіў Везуві.
Апошні раз на мармуровых лавах
лавілі вуснаў лоскат, цень надзеі.
Затым з Помпеяй казкаю заснулі...

...І гінулі яны штодзённа і штогодна,
за ласкі шчырыя, хвілінныя, за ласкі..
Дарма што з блудніцай нягоднай,
дарма, што многакраць, ня першы.
І так ад Рыму да Аляскі...

11/VIII – 25

## КАРМАЗЫНАМ АСМУЖАНЫ

Ведаеш добра: ты вельмі прыгожая,
вусны твае кармазынам асмужаны.
Вочы ненацкам жыцьцё устрывожылі
і агарнулі сукрысьтасьцю кужалю.

Чуў ды ня верыў—спатканьне на ростані.
Што ж, будзе сумная песьня, мінорная.
Наша каханьне звычайнае, простае,—
гэта туга футаралам агорнута.

Хвалямі ў хвалях, пакуль не загінулі,
нас калыхала шалёная Азія.
Можа і мы на акрайках дэльфінавых
быццам хлапчук Рафаэльвай фантазіі.

2/IV—25

# ПЕСЬНЯ, УШЧУНЬ!

Край ня знаў наш песень чыстага мажору:
поруч з весялосьцю смутак і туга.
Гэтыя палеткі, гэтыя разоры:
нельга... льга...

Чуў я навальніцы, чуў і пушчы гоман,
і вазёр, і мора гоманы я чуў.
Жалю, крыўды нейкай так было ў іх многа...
Песьня, ўшчунь!

А яна ліецца ды праз сенажаці,
і з дзявочых вуснаў і з цымбальных струн.
У шчамлёткі сэрца пачало сьціскацца
не ў пару...

Хай міноры песень сэрца болем пояць:
смутак родзіць радасьць, родзіць весялосьць.
Пунсавеюць хмары над радзімым полем...
Шчасьце ёсьць!

15. VII—25.

# О, БЕЛАРУСЬ, МАЯ ШЫПШЫНА

О, Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цьвет!
У ветры дзікім не загінеш,
чарнобылем не зарасьцеш.

Пялёсткамі тваімі стану,
на дзіды сэрца накалю.
Тваіх вачэй—пад колер сталі,—
праменьне яснае люблю.

Ніколі пройме з дзікім ветрам
не разьвіваць дзявочых кос...

. . . . . . . .

Цяпер рэспубліка Саветаў
і радасьць пунсавее скрозь.

3/V—25.

# ДАЛЁКАЕ МЫ ЛЮБІМ НАДТА

Далёкае мы любім надта,
чужыншчыне паклоны ўдол.
А хто успомніць нашы хаты
занізьзю ціхіх кволых слоў?

Поэты гымны ўсім складаюць,
а беларусам—пушча, гай.
Мая краіна дарагая,
ты прабачала—выбачай.

Такі наш лёс, такая доля,
галовы хілім нізка... Ой!
Даволі рабства ўжо, даволі,
таварыш любы, браце мой!

Хай будзе ў кожнага з нас сілы
ісьці, змагацца—сьмерць адна..—
... Ці пад ярмом, як у магіле,
ці у магіле без ярма...

Мы загартуем нашы душы
і ў час, калі апошні бой,—
як Лунінецкі Янка Глушка
заслонім Беларусь сабой.

А ворагу з пагардай скажам,
як ён незнаны наш гэрой —
спагады мы ня хочам, вашаць:
жыць без цябе, ці сьмерць з табой.

І літасьць такжа мы ня хочам
прыняць з паганых вашых рук.
Страляйце, б'еце: мае вочы
над краем бачаць ўжо зару.

29/VII—25.

# ПАКУЛЬ

Пакуль—ня мілямі, а на сажонкі
і нават вобмацкам... Ну што-ж, пакуль!
Выразна вірны гук вандруе вонках,
істужкай гукавой кладзецца на таку.

А ты, мая шыпшына, дзюбіш дзіды,—
ці шыгальлём аздобіцьме трапы?
Шалёны подых—
вобмацкам ідзі ты...
Сумысьля далані свае прабіў.

2/IV—24.

# А ТЫ, СІРАЦІНА, ЖЫВІ

А ты, сіраціна, жыві,—
хоць думкі ўсялякія зводзяць.
Тугу-безнадзейку у вір,
каб кроплі ня стала ў заводзе.

Імкніся наперад—угрунь,
ніколі ня гніся ў нядолі.
Вітай, што над краем, зару
з-пад цьмянасьці золкай і золі.

4/V—25.

# СІНЯВОКАЯ МАЯ...

Эх, сястрыца, сінявокая мая!
Дапрадаеш кужаль, шпульку дапрадаеш?
Ад кастрыцы, пылу грудзі так смыляць...
— Навівайся, нітка, роўнымі радамі!

Напрадзеш на восем мала!—дзевяць сьцен!
А старая маці у ніты укіне.
Будзе кужаль гэты ў бёрдах шалясьцець,
панажы заляскаюць—весялей дзяўчыне...

Вытчаш, вытчаш плацянковыя страі,
ручнікоў таксама у нітоў дванаццаць...
Кросны, ты і нітка—вось і утраіх...
— Будзеш над ставамі нізенька схіляцца...

Не забудзься, зоранька, ясная мая,
на адну-адзіную выткаць на кашулю,
бо і мне балюча грудзі тож смыляць,
толькі я далёка, дык таму ня чуеш...

Апрану кашулю новую тады,
да цябе, сястрыца, ў госьці я прыеду.
Ты пра вёску скажаш, я пра гарады...
Дык калі-ж прыду я, дык калі прыеду?

Ці вясной, ці ўвосень, вечарам, ці днём...
Лепш увосень, праўда?
Выйдзеш ты у поле...
Загарацца вочы сінія агнём,
Скажаш мне, сястрыца:
— Я у Комсамоле!

Я пазнала добра,—панскі сьвет замоўк,
галаву ня схіліць вораг нам ніколі!
Новае жыцьцё будуе Комсамол,
а жыцьцё старое, палын,—вон ды з поля!

Гэй, сястрыца, сінявокая мая,
нам шуміць сасоньнік і лясы гаворaць.
Хай табе ніколі грудзі не баляць
і ня знаць ніколі пажжы тэй і гора...

18/II—25

# НАВАЛА МІНУЛА

Навала мінула, навала далёка,
у сонцы праменьні ўвесь грукат загінуў.
Вершаліна дуба схілілася толькі,
са жвірам цалуецца; то—успаміны...

Як белыя косьці, наўсьцяж астрыжонкі
ў карунках зялёных—туга ў футарале.
І страціцца зелень, лістота пажоўкне;
галосяць бязгучныя соку крышталі.

---

А ліпы красуюць і з верасу водар,
расою крышталіць дыван аксамітны.
Дубы маладыя з бярозамі, воддаль,
вясеньняю смагай суздром апавіты...

11/II—25.

## МАШЫНА НАПОРНА

Машына напорна па бруку—ўсё далей.
Сабака застаўся з нагой паламанай.
І з лямантам немым у сінія далі
надрыўная боль залунала.

Дзяўчынка сьпяшалася, крок прыпыніла
і кінула чорную лусту скарынку.
Пакуту чужую ўшчувала маўкліва,
бо сэрца—яшчэ не на рынку...

І вось, мільганулі дзьве жоўтыя морды,
за хлеб—дыбам поўсьць, кроў і зубы на зубы.
Калецтва забыта... Грукоча ўсё горад
і вучыць змагацца... Дзе згуба?

11/II—25.

## АПОШНЯЯ ПЕСЬНЯ

І было у восень, калі стрыглі поле
і на полі слалі дываны з лістоў.
Засмылела сэрца ў нячуваным болю:
вельмі многа крыўды,
вельмі мала слоў.

І было у восень... Я сказаў аднойчы:
больш не дакрануцца пальцы мае струн.
І пайду да мэты сьцяўшы зубы, моўчкі,
і назад не гляну,
як калісьці Ван-Чжао-Цзюнь.

І было у восень... Я сказаў на ростань:
тое што зьвінела, больш няма таго.
І апошняй песьні завілася постаць:
жыватворчы праглынуў агонь.

6/X—25.

# КАЛІНІНШЧЫНА

Прысьвячаю
*Алесю Адамовічу*

## УСТУП

Мой любы браце, блізкі і далёкі,
няма сталёвасьці і арфазвоннасьці.
Такая сьцюжа на душы, навокал,
як дзень з дажджамі—быццам сёнешні.

Ці ж я не ведаю, ці я ня знаю,
ці я ня сын сваёй сучаснасьці—
жыцьцё крынічыць і музыкі граюць
на лад папасьці ўсё няшчасьціцца.

Часінай весела, часінай—сумна,
ідуць шляхі—ў балотах трацяцца.
А недзе злосьнікі бразгочуць бубнамі...
Даруй, даруй, мой любы браце, мне..

1

# ПАЧЫНАЕЦЦА З ГІСТОРЫІ

Такая песьня – думкі падарожныя.
Значыцца —
блёкнот і нататкі.—
Калісьці сіла наезджая і варожая
з Беларусі зьбірала падаткі.
З падаткаў будавала...
Рознае, адным словам.
А галоўным чынам—цэрквы і турмы.
Зразумела,—ня любіла беларускую мову,
бо чула ў ёй па сабе звон хаўтурны.
Успамінаць можа і ня варта,
бо было аж за царскім рэжымам.
Але ў той час гэта былі ня жарты,
і Беларусь стаяла то ніцам, то дыбам.
Часінаю не хапала пакорнасьці і цярплівосьці.
Кроў пачынала віхурыць у жылах.
Тады бралі сяляне ў рукі вілы і восьці
і тады душыў паноў Крычаўскі Вашчыла.
Карацей кажучы—
усяго хапала:
і крыві, і сьлёз, і гэройства.
Але спадчына чорнасоценнага цемрашалу
урасла ў беларускія землі глыбока і войстра.

2

# ПАДМАЦОЎВАЕЦЦА АДПАВЕДНАЮ ЦЫТАТАЙ

. . . Спрактыкаваны лейпцыгскі друкар, меўшы ўсе закавырачкі літар, ад Японіі—да Арабіі, ад Іудэі да Гішпаніі—ня меў у сваіх касах ажно дагэтуль гэтае мудрае, ліха ад-куль узятае закавыркі Ў. І ён яшчэ з недавер'ем якімсь не адлівае яе ўцалку, а мудра з асьцярогаю надстаўляе ˘ над простым У... пэўна з думкаю, што Беларусь—то-ж Заходні край у вуснах Мураўёва ці Каяловіча, а разам і не аднаго фон-Карла, да якога часова надстаўлена кароткае ˘ .

А тымчасам гэтае Ў—гэта сымбаль ідучай усё дальш і дальш уперад ужо цьвёрда ўстаўшай наногі Белаoускай Культуры.

Ці-ж трэба казаць, як натужна яе ставілі? Ці-ж паверацьз дзеравянымі заскарузлымі сэрцамі недаверкі, што яна стала сталёвай поступ'ю, абапёршыся на магутныя плечы беларускіх працаўнікоў? Не паверацьl пакуль ня ўложаць рук... пад яе поступ...

(*Ц. Гартны,* Урачыстасьць, стар. 97).

3

# ПЕРАХОДЗІЦЬ ДА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

Рэволюцыя страсанула абшары,
Рэволюцыя скалыхнула краіны.
У кастрычніку зьдзейсьніліся мары
І забыліся мы, што Расія была чужынай.
Тэю мовай—з якой згіналі на калені
і якою душылі, сьціскалі—
Загаварыў Вялікі Ленін
і загаварыў таварыш Сталін.
І такою любаю яна стала...
Але, каб лепш разумець думкі вялікія,
сьмела, паважна і стала
пачалі гаварыць беларусы
сваёю мовою звыклаю.
Называецца гэта—
беларусізацыя.
Некаторым вельмі не падабаецца.
Ну, што-ж—прыдзецца аблізацца ім,
бо ў нас хутка і робіцца, як баецца.

4

# СПЫНЯЕЦЦА НА ГЕОГРАФІІ І ЭТНОГРАФІІ

## АБШАР

Спавітая Сожам прыгожым
імкнешся да пэўнае мэты.
Цяпер ты ужо не варожыш
на зорах і розных камэтах.

Люблю я цябе, дарагая,
і веру: ня спынішся раптам.
Праз пушчы, бярэзьнікі, гаі
заўсёды да Менску патрапіш.

Гамоняць з бярозамі хвалі
і з вольхамі хвалі гамоняць...
Цымбаламі гукі крышталяць
і іх не заглушыць гармонік.

Пагуркі, даліны, прасторы
у росах і срэбным тумане.
Рабыня нядаўна, учора,
а сёньня—сама сабе пані.

## ЖЫХАРЫ

Погляд сьмелы і цьвёрды крок
і такая размашыстасьць у працы.
Што перашкоды і што там рок:
з гэткаю сілай—
з чортам у загрудкі брацца.

Выйдзе ў поле—аж крэкча плуг,
выйдзе з касою—гудзяць сенажаці.
Камень нагой разатрэ на жарству:
толькі-б стаць добра,
толькі-б упяцца.

Гэтая сіла—збудуе сьвет,
новы сьвет—права рукі мазольнай.
Хочацца гойкнуць—хай жыве
сталёвая працоўная воля!

# МАЛАДНЯК

Помню вечар—вы былі у клюбе
і віталі маладых поэтаў.
Моладзь моладасьць так моцна любіць...
Помню вечар той дагэтуль...

Вочы вашы моўчкі прысягалі,
што ня згубіце шляхоў ніколі.
Мы душу сваю тады вам далі
ў сваіх творах,—сваіх песьнях волі.

Час ідзе, складаецца ў гадзіны
і у дні складаецца таксама.
Беларусі лёс, сваёй краіны,
хутка будзеце тварыць вы самі.

Помню вечар—вы былі у клюбе
і віталі маладых поэтаў.
Моладзь моладасьць так моцна любіць...
Помню вечар той дагэтуль...

Вы упэўнілі тады усіх нас,
што стаім на правільнай дарозе
Навальніца, калі будзе, сьціхне,—
не паклонімся ліхой пагрозе.

# НЯ МОЖА АБЫЙСЬЦІСЯ БЯЗ ЛІРЫКІ

І ціхазвонна і паволі восень
лісьцё наземіць, сьцеле у даліны.
Хвіліну вецер іх цярушыць, носіць
пакуль зямлі на грудзі ня ускіне.

Няма жалобы, ня чуваць і скаргі:
тугу жыцьцё ў лісьці пазалаціла.
На Беларусі і ў пяскох Сахары
адна уцеха ім і роўная магіла.

А дні вясны маёй? Паволі такжа
і ціхазвонна ў нябыцьцё зьнікаюць.
У памяці іх сьлед ня згіне—ляжа,
і цяжкі, часам, ён, як дзікі камень.

А я! Благаслаўляю дні, што зьніклі,
вітаю дні наступнага ў трывозе.
Няўжо і вы, як гэны камень дзікі,
на шыю занізьзю мне ляжаце увосень?

З трывогай гэтай аб адным малюся:
каб дні жыцьця майго па вітай сьцежцы
вялі мяне па любай Беларусі,
дзе кожны з дрэва ліст мне сэрца цешыць.

6

## ЛІРЫКАЙ І КАНЧАЕЦЦА

Над шляхам пыл, цярушыцца на вочы,
а коні мкнуцца, ня спыняюць крок.
Чагосьці лепшага істота хоча,
а лепшае—мяздрою пад карой.

Зялёныя бярозавыя сьцены,
над імі вежы—волаты дубы.
Імкнёмся мы. імкнуцца нашы сьцені,
пытаецца душа: куды, куды?

Заўсёды заўтрашняе наша—рэбус.
Чаго тужыць, пытацца больш нашто?
Мы ведаем, што ад жыцьця нам трэба,
хоць часам думкі—кроплямі ў рышток.

Няхай і пыл цярушыцца над намі,
ня спыніць ён напружную хаду.
Нас перашкоды—цягам спатыкалі,
шляхі да мэты як вялі—вядуць!

Клімавічы-Крычаў-Мсьціслаў
1925 г.

# УВАГІ І ЗЬМЕСТ

# Ад аўтара

Вершы, зьмешчаныя ў зборніку, напісаны да 7 кастрычніка 1925 г. на працягу 23-25 г.г. і да гэтага часу не друкаваліся, за наступнымі выключэньнямі.—

1. Верш „Далёкае мы любім надта“... друкаваўся ў „Савецкай Беларусі“ ад 30/VII—25 г. і ў „Маладым Аратым“ № 12;

2. Верш „Сінявокая мая“—у „Маладым Аратым“ № 1;

3. Верш „Апошняя песьня“—у „Савецкай Беларусі“ ад 7/X—25;

4 Вершы „Калінішчына“—у „Савецкай Беларусі“ ад 8/IX—25;

5 Верш „Над шляхам пыл“..., апошні ў нізцы „Калінішчына“—у зборніку „Трысьцё“. Друкуецца другі раз затым, што органічна зьвязаны з гэтай нізкай вершаў. У гэтым зборніку павінен растлумачыць некалькі слоў —

**Ван-Чжао-Цзюнь**—дзяўчына, кітаянка. Жыла ў 30-40 г.г. пачатку нашае эры. Вылучалася нязвычайнай прыгажосьцю. Шмат кітайскіх поэтаў ахвяравалі ёй свае вершы, зьвязаныя з яе, адносна, трагічным жыцьцём.

**Янка Глушка**--беларускі паўстанец. Засуджаны ў ліпені 1925 г. польскімі панамі (Лунінец) на пакараньне сьмерцю. Адмовіўся падаваць просьбу Прэзыдэнту Польшчы аб памілаваньні. Расстраляны польскімі панамі.

**Дзіды**—мае два значэньні. Адно з іх, у якім ужываецца і ў гэтым зборніку; „шыпы“—„терния“.

# ЗЬМЕСТ

## CREDO


| | Стар. |
|---|---|
| Сьцежка | 5 |
| Нікне ўсё | 7 |
| Часіна ды з сокам рабіны | 9 |
| Паляжам мы | 10 |
| Вы мэлёдый ня слухаеце | 12 |
| Выйду, выйду, дзе гораду грукат | 14 |
| Дзіваваўся і так кахаў | 16 |
| Я шкадую усё-ж сябе | 18 |
| Вохкія сьцежкі | 20 |
| І гінулі яны | 22 |
| Кармазынам асмужаны | 23 |
| Песьня, ўшчунь | 24 |
| О, Беларусь, мая шыпшына | 25 |
| Далекае мы любім надта | 26 |
| Пакуль | 28 |
| А ты, сіраціна, жыві | 29 |
| Сінявокая мая | 30 |
| Навала мінула | 32 |
| Машына напорна | 33 |
| Апошняя песьня | 34 |

КАЛІНІНШЧЫНА

Стар.

Уступ . . . . . . . 37

Пачынаецца з гісторыі . . . 38

Падмацоўваецца адпаведнаю цытатай . 39

Пераходзіць да беларусізацыі . . 40

Спыняецца на географіі і этнографіі

1. Абшар . . . . 41

2. Жыхары . . . . 42

3. Маладняк . . . . 43

Ня можа абыйсьціся бяз лірыкі . . 45

Лірыкай і канчаецца . . . . 47

Ад аўтара . . . . . 51

## Творы маладнякоўцаў

1. **А. Александровіч**—Па беларускім бруку. Вершы 1924 г.
2. „ —Паўстанцы. Поэма-інсцэніроўка. Менск 1925 г.
3. **А. Бабарэка**—апавяданьні. Менск—1925 г.
4. **А. Вольны і А. Александровіч**—Комсамольская нота. Вершы. Менск—1924 г.
5. **А. Вольны, А. Александровіч, А. Дудар**—Ваўчаняты. Раман. Менск—1925 г.
6. **А. Вольны**—Два. Аповесьць. Менск—1925 г.
7. „ — „ на яўрэйскай мове („Цвей“) Менск—1925 г.
8. „ —Чорнакудрая радасьць. Вершы (друкуюцца).
9. **А. Гурло**—Барвенак. Вершы. 1924 г.
10. „ — Вершы. (Друкуюцца).
11. **Ул. Дубоўка**—Строма. Вершы. Вільня—1923 г.
12. „ —Там, дзе кіпарысы. Поэма. Менск—1925 г.
13. „ —Трысьцё. Вершы. Менск—1925 г.
14. „ —Трыкліні. Вершы (рыхтуюцца да друку).
15. **А. Дудар**—Беларусь бунтарская. Вершы—1925 г.
16. „ —Сонечнымі сьцежкамі. Вершы (друкуюцца).
17. „ —Шанхайскі шоўк. Поэма (друкуецца).
18. **М. Зарэцкі.**—У віры жыцьця. Апавяданьні. Менск—1925 г.
19. „ —Пела вясна. Апавяданьні Менск—1925 г.
20. „ —Пад сонцам. Апавяданьні (друкуюцца).

21. **Крапіва**—Асьцё. Сатыры. Менск—1925 г.
22. „ —Крапіва. Сатыры. Менск—1925 г.
23. „ —Апавяданьні. (друкуюцца).
24. **Я. Пушча**—Раніца рыкае. Вершы. Менск. 1925 г.
25. „ —Вершы (друкуюцца).
26. **Я. Падабед**—Плывём. Вершы. (друкуюцца).
27. **Л. Родзевіч**—Пакрыўджаныя. Драма. Менск—1921 г.
28. „ —Беларусь. Вершы. Вільня—1923 г.
29. **П. Трус**—Вершы. Менск—1925 г.
30. **С. Хурсік**—Першы паўстанак. Апавяданьні. Менск—1925 г.
31. **М. Чарот**—Завіруха. Менск—1922 г.
32. „ —Босыя на вогнішчы. Поэма. 3 выд. Менск—1925 г.
33. „ —Веснаход. Апавяданьні. Менск—1924 г.
34. „ —Вершы. Менск. 1925 г.
35. „ —Пастушкі. Алеська і Данілка, П'есы Клімавічы—1925 г.
36. „ —Карчма. Поэма (друкуецца).
37. **К. Чорны**—Апавяданьні. Менск—1925 г.
38. „ —Срэбра жыцьця. Апавяданьні Менск—1925 г.
39. „ —Апавяданьні. Том I-ы. (рыхтуецца да друку).
40. „ —Зямля. Аповесьць. (падрыхтавана да друку)

---

156482.
352907.

Бел. аддзел
1994 г.



ЦАНА
20 кап.

529

1964 г.

А. ТЫЧЫНА